# ГУЛЬНЯ-ДРАМАТЫЗАЦЫЯ ЯК СРОДАК РАЗВІЦЦЯ ВЫРАЗНАГА БЕЛАРУСКАГА МАЎЛЕННЯ ДАШКОЛЬНІКАЎ

**Д.М. Дубініна,БДПУ, г. Мінск**

The article focuses on the use of theater games based on the Belarusian folk tales for the development of figurative speech detey.Avtor disclose the contents and methods and techniques for working with children to develop their figurative speech.

Важнай камунікатыўнай якасцю культуры маўлення з’яўляецца выразнасць. Яе асновы закладваюцца ў дзяцінстве, калі праяўляецца найбольшая ўспрымальнасць да роднай мовы, да яе мастацкіх сродкаў. Менавіта з дапамогай выразнасці маўленне дашкольніка становіцца больш прыгожым і пераканаўчым.

Маўленне выразнае, калі яно пабудавана так, што асаблівасцямі сваёй структуры, падборам моўных сродкаў уздзейнічае не толькі на свядомасць, але і на пачуцці чалавека, калі яно “падтрымлівае ўвагу і цікавасць слухача або чытача” [5, 186]. Выразнасць маўлення забяспечваецца арыгінальнасцю і самастойнасцю мыслення, добрым веданнем прадмета гаворкі і выяўленчых магчымасцей мовы.

Развіццё выразнага маўлення з’яўляецца значнай састаўной часткай выхавання культуры маўлення. Маўленне становіцца выразным і вобразным у тым выпадку, калі ў дзіцяці выхоўваецца цікавасць да моўнага багацця, развіваецца ўменне выкарыстоўваць у сваім маўленні самыя разнастайныя вобразныя сродкі.

Асаблівае значэнне вырашэнне гэтай праблемы набывае ва ўмовах блізкароднаснага білінгвізму. Старэйшыя дашкольнікі, што выхоўваюцца ў дзіцячым садзе з рускім моўным рэжымам, павінны навучыцца размаўляць на беларускай мове не толькі правільна, але і выразна.

Асноўным прызначэннем выразнасці маўлення з’яўляецца забеспячэнне эфектыўнасці камунікацыі, разам з тым выразнасць можна

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

лічыць важным сродкам маўленчага самавыражэння асобы. Дашкольнік з выразным маўленнем адчувае сябе больш свабодна і ўпэўнена ў любой сітуацыі дзякуючы таму, што можа адэкватнымі сродкамі выказаць думкі і пачуцці, паказаць сваю творчую індывідуальнасць. Выразнасць маўлення дазваляе дзіцяці больш ярка выявіць сябе ў розных відах дзейнасці, і перш за ўсё ў гульнявой і мастацкай.

Вядома, што першаасновы выразнасці маўлення закладваюцца ў дашкольным узросце. У працах С.Л. Рубінштэйна і А.М. Лявушынай паказаны генезіс выразнасці маўлення дашкольнікаў: ад неўсвядомленых, афектыўных формаў выразнасці, выкліканых павышанай эмацыянальсцю малодшага дашкольніка, паступова пад уздзеяннем асяроддзя і навучання ў старэйшым дашкольным узросце дзіця пераходзіць да ўсвядомленага выкарыстання выразных сродкаў.

Перадумовамі засваення старэйшымі дашкольнікамі выразных сродкаў з’яўляецца ўласцівая дзецям эмацыянальнасць, а таксама наяўнасць у дашкольнікаў асаблівага “адчування мовы”. Аднак самі па сабе яны не гарантуюць выразнасці маўлення, працэс развіцця якога апасродкаваны мэтанакіраваным узаемадзеяннем педагога і дзяцей. Для таго, каб дапамагчы дзіцяці авалодаць словам як сродкам камунікацыі, неабходна спецыяльна звярнуць яго ўвагу на выразнасць гэтага слова з усіх яго бакоў (гукавога, сэнсавага, марфалагічнага, сінтаксічнага) і ва ўсіх яго сувязях.

Паколькі важнай задачай ў фарміраванні выразнасці беларускага маўлення з’яўляецца адпрацоўка навыкаў і ўменняў слухаць і разумець беларускае маўленне, заўважаць тыя асаблівасці, што надаюць яму выразнасць і вобразнасць, то асноўным зместам першапачатковага азнаямлення дзяцей з багаццем беларускай мовы павінен стаць фальклор. Ён з’яўляецца тым сродкам, які дапамагае дзіцяці асэнсаваць ўсё багацце беларускай мовы, а таксама выклікае ў выхаванцаў жаданне навучыцца размаўляць па-беларуску.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Захапляльнасць, вобразнасць, эмацыйнасць, дынамізм твораў вуснай народнай творчасці блізкія псіхалагічным асаблівасцям дзяцей, іх спосабу думаць, адчуваць, успрымаць навакольны свет, выяўляць адносіны да з’яў і падзей. Спецыфіцы ўспрымання, моўнай і камунікатыўнай кампетэнтнасці дашкольнікаў у большай меры адпавядаюць казкі, забаўкі з дыялагічнай пабудовай.

Засваенне моўнага багацця, заключанага ў творах вуснай народнай творчасці, уводзіць дзіця ў свет сродкаў мастацкай выразнасці мовы, а творчае адлюстраванне эмацыйнага зместу дадзеных тэкстаў у розных відах гульнявой дзейнасці забяспечвае практычнае засваенне выразнасці маўлення

Уключэнне твораў фальклору ў вядучую дзейнасць дашкольнага ўзросту – гульню дае магчымасць зрабіць працэс успрымання і асэнсавання выразных сродкаў беларускага фальклору непасрэдным і цікавым і аказвае пазітыўны ўплыў на фарміраванне выразнасці беларускага маўлення дашкольнікаў.

Асноўнай формай работы па развіцці выразнага і вобразнага маўлення дзяцей выступаюць сюжэтныя творчыя гульні па матывах твораў вуснай народнай творчасці, у першую чаргу, гульні-драматызацыі. У гульні-драматызацыі дзіця, выконваючы ролю ў якасці “артыста”, самастойна стварае вобраз з дапамогай сродкаў вербальнай і невербальнай выразнасці. Відамі гульні-драматызацыі з’яўляюцца:

– гульня-імітацыя вобразаў жывёл, людзей, літаратурных персанажаў;

– ролевы дыялог на аснове фрагмента тэксту;

– інсцэніроўка ўрыўка ці цэлага твора;

– гульня-імправізацыя з разыгрываннем сюжэта ці аб’яднанне некалькіх сюжэтаў без папярэдняй падрыхтоўкі.

Ва ўмовах двухмоўя ў якасці літаратурнага матэрыялу для гульні-драматызацыі лепш выкарыстоўваць беларускія народныя казкі пра жывёл. Па-першае, яны вызначаюцца невялікім аб’ёмам і тыповымі казачнымі формуламі, па-другое, характарызуюцца вельмі простай і дакладнай мовай,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

па-трэцяе, гэтыя казкі маюць шматлікія паралелі ва ўсходнеславянскім фальклоры. Улічваючы, што з рускай народнай творчасцю дзеці знаёмяцца значна раней, прапануецца ў працэсе азнаямлення дзяцей з беларускім фальклорам звяртаць увагу выхаванцаў на падабенства сюжэтаў і вобразаў казачных твораў беларускага і рускага фальклору (напрыклад, такіх казак, як “Зайкава хатка” і “Заячья избушка”, “Коцік, пеўнік і лісіца” і “Кот, петух и лиса”, “Каза-манюка” і “Коза-дереза”).

Гэта значна паглыбляе мастацкае ўспрыманне зместу казкі дзецьмі і станоўча адбіваецца на яго творчым узнаўленні ў працэсе гульні-драматызацыі.

ЛІТАРАТУРА

1. Акулова, О.В. Театрализованные игры / О.А. Акулова // Православный образовательный Портал «Слово». [Электронный ресурс]. – 2010.–Режим доступа: http://www.portal-lovo.ru/pre_school_education/36458.php.

2. Артемова, Л.В. Театрализованные игры дошкольников: Книга для воспитателя детского сада / Л.В. Артемова. – М.: Просвещение, 1991. – 127 с.

3. Асновы культуры маўлення і стылістыкі / У.В.Анічэнка, У.Д. Еўтухоў, В.А. Ляшчынская, Т.І. Тамашэвіч. – Мінск, 1992. – 255 с.

4. Леушина, А.М. Развитие связной речи у дошкольника / А.М. Леушина // Хрестоматия по теории и методике развития речи детей дошкольного возраста. – М.: Издат. Центр Академия, 1999. – С. 358 – 369.

5. Рубинштейн, С.Л. Основы общей психологии / С.Л. Рубинштейн. – М.: Педагогика, 1989. – 486 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ